Алег Дашкевіч



...от жа, скаціна, а як чалавек, як чалавек...

# Кабанчык

***Аповед***

У садзе, падчэпленая да галінаў старой грушы, вісіць вялізная кабанова туша. Пад ёю на сьнезе стаіць міска, куды сьцякае кроў. Дзед Ян падстаўляе пад струменьчык крыві медную конаўку. Побач, у запэцканым крывёй ватніку, стаіць дзядзька Міша.

Настылая на марозе медзь пакрысе запаўняецца чырвоным. Ад конаўкі ўгару падымаецца густая пара.

Гадзіну таму дзядзька Міша, наваліўшыся на кабана і чухаючы за хракавым вухам, мерыўся вызваліць кабанову душу на волю даўгою, вузкаю, з канаўкай для сьцёку крыві, калёнай швайкай. Але ў самы адказны момант, калі лязо зьбіралася ўджаліць сваім холадам сэрца жывёлы, на сцэне зьявіўся я, шасьцігадовы падшыванец, і з выглядам бывалага вайсковага хірурга зазначыў:

— Да-а, жалка кабанчыка...

— Што ты, саплё, пад руку лезеш, — злосна вылаяўся разьюшаны дзядзька, ускочыў і даў мне высьпятка.

Конаўка запоўнілася чырвоным, дзед нагбом, толькі кадык, як поршань рухаўся, выпіў да донца. Пакуль ён выціраў пачырванелую вакол вуснаў шчэць, дзядзька плескануў у конаўку гарэлкі, і дзедаў кадык запрацаваў ізноў.

— Наступнага сам будзеш біць, — дзядзька працягнуў швайку ў мой бок.

Наступных прывезьлі з Ракаўскага рынку ў траўні. Двор аж зазьвінеў ад віску і енку. Цётка Насьця адразу, як іх парасятаў вывернулі з меху на зямлю, пазачыняла дзьверы на вуліцу на засаўкі: «Зараз жа Чыта, з 13 дому прыбяжыць, крый Божа. Мінулым летам, як зірнула вокам сваім зайздросным, з кабаном невядома, што ўсчалося».

На вуліцы майго дзяцінства, што месьцілася на высьпе прыватнага сектару, між чыгункай і старым менскім аэрапортам, жывёлу трымалі праз дом. А тыя, хто ня меў, зьбіралі і аддавалі рэшткі прадуктаў тым, хто гадаваў.

Мае прыяцелі па дзіцячых гульнях — лапавухі й саплівы Чыцін сынок Сяргей, і мой сусед-раўналетка Дзімка, што кожную раніцу гвалціў фано і быў гонарам сваёй бабулі Гэлі, — штодзень грукалі ў нашую браму і высыпалі свае валізкі ў вялікую эмаліраваную місу. Калі ж прыходзіў час сьвежыны, з валізкамі ў зваротным кірунку выпраўляўся я. Такая была народная кааперацыя.

Апроч суроку баяліся нашыя людзі яшчэ адной, як казала бабуля, трасцы — «праверак са спалкому», якія зьяўляліся раптоўна, як татарскі наскок, і, угледзеўшы ў двары свойскую жывёлу, з імпэтам баскакаў, абкладалі яе шалёнымі савецкімі падаткамі. Аднойчы, такая праверка ледзь не падарвала мой аўтарытэт.

Тоўстая «спалкомаўская» цётка з разьлінаваным нататнікам выпытвала ў бабы Ані:

— Ёсьць жывёлка?

— Не, даражэнькая, надта ж дарага. Вунь толькі сабака Джэк бегае.

Але тут, на бабчына няшчасьце, улез у размову я.

— А кабаны, бабуля? Ты што, забыла? Там, у хлеўчуку.

У памяці застаўся адно роспачны бабчын погляд і кайстра «спалкомаўскай» цёткі, якая зрабілася пузатай, калі тая выходзіла з нашага двара.

З Рыжым мы пасябравалі адразу, як толькі таго вывернулі з меху. Памыты ў начоўках і адшараваны дзеркачом, захутаны ў чыстую анучу, шчасьлівы мой новы сябрук смактаў з соскі сыроватку.

Во быў час, ці то з захапленьнем, ці то з роспаччу, скажа гадоў праз дваццаць, пры канцы саўка, выпадкова сустрэты ў чарзе па мыла, мой дзіцячы знаёмец, — сьвіней хлебам выкормлівалі. Праўда. Раз на два-тры дні мы сядалі на ровары і выпраўляліся да хлебнае крамы, што на

вуліцы Чкалава. Купіўшы шэсьць-восем боханоў па 14 капеек, ляцелі назад. Але ж ня хлебам адзіным, як той казаў.

Мы з бабкай Аняй выходзім на недалёкую пустку па сечку. Я поўзаючы наўколенцах, ірву траву рукамі, бабуля на нягнуткіх, хворых нагах, рэжа нажом. Пасьля мы зьбіраем дзічкі, пасьля яшчэ нешта. Для бабулі так кожны дзень.

Потым я таўку ў чыгунку старую парослую бульбу, а бабуля ставіць на газ вядро з варывам для жывёлы. Варыва будзе сьпець паўтары гадзіны. Іншым разам за гэты час я выслухаю ў бабуліным выкананьні, цэлы канцэрт беларускай аўтэнтыкі, які, чамусьці, пачынаўся і сканчаўся «Зялёнаю вішняй».

Мінала лета. Рыжы вырас у важкага кабанчыка, але працягваў хадзіць за бабуляй, як той сабака. Бабуля таксама ставілася да яго асабліва. Казала яму нешта, скардзілася на крыўды ці проста скрэбла сьпіну грэбенем.

Мы з Рыжым гулялі ў футбол і радэа. Радэа было нашым каронным нумарам. Гойсаючы на ягонай сьпіне ў фетравым капелюшы, я ўяўляў сябе героем твораў Майн Рыда ды Фенімора Купера.

Аднойчы пад зіму да бабкі на веранду, дзе даходзіла сьвінячае варыва, зайшоў дзядзька Міша.

— Калі ты, Аня, свайго біць думаеш, на Каляды ці пазьней?

— Ня ведаю, — не адразу адказала бабка, — шкада мне яго, Міша. Прывыкла я да яго.

— Шкада будзе, калі сьвежыны ня будзе, — заўважыў дзядзька.

Толькі тады я згадаў пра сталёвую швайку, медную конаўку і патэльні са сьвежынай. Калі дзядзька выйшаў, я спалохана зірнуў на бабулю.

Яна толькі сумнавата-стомлена ўсьміхнулася.

Ішоў час, я прыязджаў да бабулі радзей. Рыжы рабіўся ўсё больш мажным. Яго ўжо меней выпускалі ў двор, а пра нашае радэа я зусім забыўся.

Неяк прыехаўшы, я не адразу зьвярнуў увагу на тое, што з хлява не чуваць знаёмага рохканьня. Але калі зразумеў, пытацца пра тое ўжо не хацелася.

Рыжага зьвёз стары бартавы «ЗІЛ». Ён сам зайшоў па хісткіх мастках у кодаб. Пасьля таго, як прыбралі масткі, з маленьніх вочак вялізнага кабана адна за адной выцеклі дзьве сьлязіны. Бабуля стаяла абапёршыся сьпінай на браму, у яе таксама цяклі сьлёзы.

— От жа, скажы: скаціна, а як чалавек, як чалавек, — бубніла сабе пад нос адна цікаўная наша суседка. Яна мне і распавяла пра разьвітаньне бабулі з Рыжым, калі шмат гадоў пазьней мы сустрэліся ў краме ў чарзе па сьвініну.